ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№11 (1044) | ЧАЦВЕР, 12 чэрвеня 2003 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НОВЫ АДРАС СУПРАЦОЎНІЦТВА

На базе Тульскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Л.М. Талстога адбылася V Міжнародная канферэнцыя "Алгебра і тэорыя лічбаў: сучасныя праблемы і дадаткі". Расійскія вучоныя запрасілі прыняць у ёй удзел і калег-матэматыкаў з Гомельшчыны, якая шырока вядома ў навуковых колах сваёй моцнай алгебраічнай школай. Запрашэнне было з удзячнасцю прынята ў нашым універсітэце. Яго прадстаўлялі на канферэнцыі ў г. Туле член-карэспандэнт НАН Беларусі, д.ф-м.н., прафесар, загадчык кафедры алгебры і геаметрыі Л.А. Шамяткоў і начальнік навукова-даследчага сектара дацэнт В.Р. Сафонаў.

На пленарным і секцыйных пасяджэннях канферэнцыі, у якіх прынялі ўдзел вучоныя-матэматыкі як з краін СНД, так блізкага і далёкага замежжа, было заслухана і абмеркавана каля 30 дакладаў аб выніках даследаванняў у галіне алгебры і тэорыі лічбаў на сучасным этапе. Л.А. Шамяткоў выступіў з грунтоўным пленарным дакладам "Фактарызаваныя групы і фармацыі".

Госці мелі магчымасць падрабязна азнаёміцца з Тульскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам – адной з буйнейшых ВНУ Расіі: на 11 яго факультэтах па дзённай і завочнай формах навучання набываюць вышэйшую адукацыю каля 7 000 студэнтаў, на 47 кафедрах працуе 500 выкладчыкаў, у тым ліку 52 доктары, 265 кандыдатаў навук. ТДПУ імя Л.М. Талстога ўваходзіць у Міжнародную асацыяцыю універсітэтаў пры ЮНЕСКА, супрацоўнічае з ВНУ Германіі, Польшчы, Славакіі, Францыі, Аўстрыі, Даніі, Вялікабрытаніі, ЗША, Японіі.

Л.А. Шамяткова і В.Р. Сафонава таксама вельмі зацікавіў факультэт матэматыкі і інфарматыкі, у час наведвання якога ўзнікла ідэя аб заключэнні дагавора аб супрацоўніцтве паміж ГДУ імя Ф. Скарыны і ТДПУ імя Л.М. Талстога. Адбылася іх зацікаўленая размова з яго рэктарам доктарам педагагічных навук, прафесарам Н.А. Шайдэнка і прарэктарам па навукова-даследчай рабоце доктарам хімічных навук, прафесарам У.А. Субоціным, у час якой В.Р. Сафонаў падрабязна расказаў пра наш універсітэт, яго навуковыя школы, прадставіў распрацоўкі нашых вучоных па самых розных накірунках і інш. У выніку быў падпісаны дагавор аб навукова-тэхнічным, творчым і навукова-метадычным супрацоўніцтве паміж нашым універсітэтам і расійскай ВНУ. Ім, у прыватнасці, прадугледжваецца выкананне сумесных навуковых даследаванняў і распрацовак, узаемны абмен навукова-тэхнічнай інфармацыяй, ноу-хау і навукова-вытворчым вопытам, ажыццяўленне мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў, стварэнне сумесных прадпрыемстваў, бізнес-цэнтраў, часовых навуковых калектываў. Плануецца арганізацыя і правядзенне сумесных навуковых сімпозіумаў, канферэнцый, семінараў, стажыровак, узаемнае рэцэнзіраванне навукова-даследчых работ і дысертацый і г.д.

Вельмі моцным па свайму духоўнаму ўзрушэнню, заключным акордам паездкі на тульскую зямлю стала знаёмства ўдзельнікаў канферэнцыі з музеем Л.М. Талстога ў Яснай Паляне.

**На Савеце універсітэта**

### ДЫПЛОМЫ – ЛАЎРЭАТАМ

Пасяджэнне Савета універсітэта, якое адбылося 29 мая, пачалося са Скарынаўскіх навуковых чытанняў. Сёлета іх лаўрэатамі сталі ст.выкладчык кафедры псіхалогіі І.З. Алеўская, к.т.н., дацэнт кафедры АСАІ А.М. Дземідзенка, к.ф.н., дацэнт кафедры беларускай літаратуры С.І. Ханеня, аўтарскі калектыў у складзе к.г.н., дацэнтаў кафедры гісторыі Беларусі М.І. Старавойтава, А.І. Зелянковай і к.г.н., заг. кафедры гісторыі Беларусі В.П. Пічукова. Яны выступілі са сваімі навуковымі паведамленнямі аб работах, за якія атрымалі ганаровае званне.

Першы прарэктар ГДУ А.П. Кармазін уручыў ім дыпломы лаўрэатаў Скарынаўскіх чытанняў-2003, канверты з матэрыяльным заахвочваннем, пажадаў далейшых творчых поспехаў у рабоце, навуковай дзейнасці, асабістага шчасця.

### АБ ВЫНІКАХ АТЭСТАЦЫІ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЙ

З гэтай інфармацыяй выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С.Ф. Каморнікаў. Адзначалася, што ў ходзе атэстацыі, якая прайшла ва універсітэце з 13 па 16 мая, заслуханы ўсе загадчыкі кафедр, якія правялі карпатлівую работу па перапрацоўцы планаў спецыялізацый. Па выніках іх атэстацыі навукова-метадычным саветам рыхтуецца дакумент "Палажэнне аб спецыялізацыі ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны".

### СТУДЭНЦКАЯ ПРАКТЫКА: МАГЧЫМАСЦІ І ПРАБЛЕМЫ

Неад'емная частка вучэбнага працэсу – вясеннелетнія практыкі будучых спецыялістаў. Аб тым, як сёлета іх будуць праходзіць студэнты універсітэта, расказала кіраўнік вытворчай практыкі Ю.Д. Алейнік. З-за недахопу фінансавых сродкаў з арганізацыяй выязных практык узнікаюць пэўныя праблемы, вырашэнне якіх шукаюць агульнымі намаганнямі як кіраўніцтва ГДУ, так і самі факультэты.

Засяроджана ўвага на неабходнасці прапрацоўкі пытання ўжо зараз аб выбары месцаў будучых практык для студэнтаў, якія паступяць на новую спецыяльнасць "Лясная гаспадарка".

***

На Савеце выбраны і перавыбраны на вакантныя пасады прафесарска-выкладчыцкі састаў, зацверджаны план НДР на бягучы год, вучэбныя планы спецыяльнасцей завочнага факультэта, разгледжаны іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

**У рамках доўгатэрміновага супрацоўніцтва, заключанага паміж нашым універсітэтам і адміністрацыяй свабоднай эканамічнай зоны "Гомель-Ратон", пяцікурснікі эканамічнага факультэта пішуць дыпломныя работы, звязаныя з тэматыкай дзейнасці СЭЗ.**

**Сярод сёлетніх выпускнікоў, якія абралі тэму такой накіраванасці ў якасці свайго дыпломнага праекта, – студэнт 5 курса эканомфака Сяргей Каморнікаў. За паспяховую яе распрацоўку ён удастоены імянной стыпендыі і адпаведнага дыплома, які ўручыў юнаку кіраўнік адміністрацыі СЭЗ "Гомель-Ратон" У.Ф. Бык (на здымку).**



### СУСТРЭЧА ПРАЗ 30 ГАДОЎ

Кранальнай, хвалюючай можна назваць падзею, што адбылася напрыканцы мая на факультэце фізічнай культуры. Першыя яго выпускнікі, што атрымалі дыпломы ГДУ роўна 30 гадоў назад, сабраліся ў актавай зале універсітэта, каб успомніць свае студэнцкія гады, выкладчыкаў, якія вялі іх па дарозе ведаў, яшчэ раз падзякаваць ім за іх прафесіяналізм, адданасць справе падрыхтоўкі і выхавання высокакваліфікаваных спецыялістаў для сферы фізічнай культуры і спорту.

Сярод былых студэнтаў-выпускнікоў 1973 года сёння шмат вядомых не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі спартсменаў, работнікаў фізічнай культуры, заслужаных трэнераў, тых, хто звязаў сваё жыццё з навуковай дзейнасцю.

У сустрэчы прыняў удзел прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С.Ф. Каморнікаў.

**Імі ганарыцца універсітэт**

## ЮРЫСТ - ПРАФЕСІЯ АДКАЗНАЯ



Якім павінен быць будучы слуга закона? Ведаючым, сур'ёзным, ураўнаважаным, сумленным, гуманным і... з добрым пачуццём гумару. Канстанцін Дзегцяроў, студэнт 5 курса юрыдычнага факультэта, стыпендыят імя П. Броўкі, паказаўся мне менавіта такім чалавекам. У пачатку нашай размовы я адчула адказнасць за кожнае сказанае мной слова, здавалася, што пачую ад яго: "Усё, што вы скажаце, можа быць скарыстана ў судзе супраць вас". Але Канстанцін з усмешкай цярпліва выслухаў мае "веды" ў галіне заканадаўства і даволі даступна расказаў аб сутнасці праблемы, над якой працуе пад кіраўніцтвам дэкана юрыдычнага факультэта к.ю.н., дацэнта Юрыя Андрэевіча Ключнікава. Публікацыі Канстанціна асвятляюць асаблівасці крымінальнага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь.

З 2-га курса К. Дзегцяроў працуе грамадскім памочнікам следчага ў пракуратуры Савецкага раёна г. Гомеля.

**– Канстанцін, што ўваходзіць у твае абавязкі?**

– У асноўным, гэта разнос позваў, удзел у пасяджэннях суда ў якасці панятога.

**– Якія твае адносіны да прынцыпу старажытных суддзяў "вока за вока"?**

– Я – за мудрую дэмакратызацыю заканадаўства. Кожны мае права на абарону сваіх інтарэсаў у судзе.

**– А ў будучым ты бачыш сябе адвакатам?**

– Не, пракурорам.

**– Якія твае адносіны да смяротнай кары?**

– Я супраць яе. Па-першае, ніхто не мае права пазбавіць чалавека жыцця; па-другое, смяротная кара нічога не зменіць у крымінальным свеце: злачынстваў меней не будзе.

**– А ці даводзілася ў жыцці быць у ролі суддзі?**

– У пэўнай ступені – так. Доўгі час выступаў у якасці суддзі ў Дэбат-клубе "Спікер", які вось ужо два гады дзейнічае на базе нашага юрыдычнага факультэта. Сюды ўваходзяць актыўныя студэнты ГДУ, якія не абыякавыя да праблем грамадства. Дзве каманды абмяркоўваюць які-небудзь "законапраект" (дарэчы, палітыку і рэлігію мы прынцыпова не закранаем), а суддзя вырашае спрэчкі. Члены Дэбат-клуба, якія найбольш вызначыліся, кожныя паўгода прымаюць удзел у рэспубліканскім турніры, які праводзіцца ў Стайках пад эгідай міжнароднай арганізацыі "Idea". Я хацеў бы адзначыць нашых чэмпіёнаў – студэнтаў групы П-54 юрыдычнага факультэта Аляксея Пухнарэвіча і Міхаіла Пагуляева, лепшы прамоўца ў нас – Дзмітрый Рыбалка.

**– І цяжка судзіць?**

– Усё павінна быць згодна закона.

**Т. ЦЕЛЯХОВІЧ.**
**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За добрасумленную і плённую працу па развіцці фізічнай культуры і спорту Гомельскай вобласці, вялікі ўклад у падрыхтоўку спартыўнага рэзерву, спартсменаў высокага класа і ў сувязі з Днём работнікаў фізічнай культуры і спорту Ганаровымі граматамі ўпраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама ўзнагароджаны дэкан факультэта фізічнай культуры **НАРСКІН Генадзь Іванавіч** і выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту **ГАЛАВАЧ Уладзімір Аляксандравіч.**

***

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці старшы выкладчык кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці **АДУЛА Зінаіда Іванаўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.

***

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем выкладчык кафедры спартыўных дысцыплін **ІВАНЕЦ Аляксандр Якаўлевіч** узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры бухуліку і АГД **БАБЫНУ Уладзіміра Піліпавіча** з прысваеннем яму Прэзідыумам ВАКа Рэспублікі Беларусь вучонага звання прафесара.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканаты філалагічнага і фізічнага факультэтаў горача віншуюць **СУСЛАВУ Наталлю Уладзіміраўну** з кафедры рускай літаратуры, **МІХАЛКІНУ Тамару Анатольеўну** з кафедры рускага, агульнага і славянскага моваазнаўства і **ВАРУЕВА Андрэя Валер'евіча** з кафедры АСАІ з прысваеннем ім Прэзідыумам ВАКа Рэспублікі Беларусь вучонага звання дацэнта.

# ЗАПРАШАЕ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

**Даўнія цесныя вучэбныя, навуковыя сувязі існуюць паміж ГДУ імя Ф. Скарыны і вядучай вышэйшай навучальнай установай у нацыянальнай сістэме адукацыі – Белдзяржуніверсітэтам. Многія высокакваліфікаваныя спецыялісты, падрыхтаваныя ў сценах БДУ, цяпер плённа працуюць у нашым універсітэце, а таксама ў самых розных сферах народнай гаспадаркі Гомельшчыны.**

**У БДУ зацікаўлены, каб на яго факультэтах вучыліся прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў нашай рэспублікі. Артыкул, які публікуецца ніжэй, больш падрабязна пазнаёміць тых, хто захоча пастпаць на вучобу ў БДУ, з яго факультэтамі і спецыяльнасцямі, што дапаможа многім вызначыцца ў выбары сваёй будучай прафесіі.**

Беларускі дзяржаўны універсітэт у 2003 годзе плануе залічыць на 1 курс на дзённую бюджэтную форму для навучання па 49 спецыяльнасцях не менш 1825 студэнтаў і на завочную па 21 спецыяльнасці – 450. За апошнія гады ў БДУ ўведзены новыя для нашай краіны спецыяльнасці: дакументазнаўства і інфармацыйнае забеспячэнне кіравання, лінгвакраіназнаўства, камп'ютэрная бяспека і інш. Ужо на працягу трох гадоў юрыдычны каледж БДУ забяспечвае падрыхтоўку юрыстаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй як на аснове сярэдняй, так і на аснове базавай адукацыі.

Залічаныя на ўсе спецыяльнасці дзённай формы навучання таксама, як і студэнты 2-3 курсаў у 2003-2004 навучальным годзе будуць навучацца па двухступеньчатай сістэме. Вышэйшую адукацыю першай ступені з прысуджэннем ступені бакалаўра і адпаведнай кваліфікацыі можна атрымаць за 4 гады навучання. За пяць або шэсць гадоў навучання выпускнікі атрымаюць адпаведна дыплом спецыяліста або магістра, які будзе пацвярджаць аб атрыманай вышэйшай адукацыі другой ступені. Дыплом бакалаўра дасць права на заняцце пачатковых пасад, якія патрабуюць наяўнасці вышэйшай адукацыі. Адсутнасць другіх дыпломаў аб вышэйшай адукацыі ні ў якім разе не з'яўляюцца абмежаваннем для назначэння ў далейшым на больш высокія пасады, за выключэннем права на заняцце навуковых пасад або пасад, якія звязаны з выкладчыцкай дзейнасцю ў сярэдніх спецыяльных або вышэйшых навучальных установах. Пры паступленні ў аспірантуру таксама неабходна будзе мець вышэйшую адукацыю другой ступені.

Правілы прыёму ў БДУ на 1 курс у 2003 годзе маюць шэраг асаблівасцей і адрозненняў ад правіл прыёму мінулага года. Упершыню прыёмная камісія будзе ўлічваць сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання, якое праведзена ў 2003 годзе Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў, на экзаменах па матэматыцы (пісьмова), фізіцы (пісьмова), беларускай або рускай мове (пісьмовае тэсціраванне). На гуманітарных і эканамічным факультэтах экзамен па беларускай мове і літаратуры, рускай мове і літаратуры праводзіцца прыёмнай камісіяй БДУ ў выглядзе пісьмовага тэсціравання або сачынення ў залежнасці ад спецыяльнасці.

Пры паступленні на дзённую бюджэтную форму навучання на факультэты: механіка-матэматычны, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, фізічны, радыёфізікі і электронікі, біялагічны, эканамічны конкурс будзе праведзены па факультэце ў цэлым. Пры паступленні на факультэты: хімічны, геаграфічны, гістарычны, журналістыкі, юрыдычны агульны конкурс будзе ажыццяўляцца толькі па роднасных спецыяльнасцях.

На спецыяльнасці факультэтаў: філасофіі і сацыяльных навук, міжнародных адносін, юрыдычнага, журналістыкі, а таксама на спецыяльнасці "славянская філалогія" і "рамана-германская філалогія" філалагічнага факультэта медалісты здаюць усе экзамены. На спецыяльнасці другіх факультэтаў медалісты, якія атрымаюць на профільным экзамене адзнакі "10", "9", "8", будуць залічваца без здачы астатніх экзаменаў.

Абітурыенты, якія паступаюць на прыродазнаўчыя факультэты, у парадку эксперыменту, не будуць здаваць экзамен па замежнай мове, які і ў мінулыя гады здаваўся па іх жаданні. На гэтых факультэтах адзнака, якая атрымана па беларускай або рускай мове, павінна быць станоўчай, але яна не будзе ўлічваца пры падліку набраных балаў пры залічэнні па конкурсе, а можа быць улічана толькі пры роўных іншых умовах. Гэтыя змены значна спрашчаюць падрыхтоўку да ўступных экзаменаў на спецыяльнасці фізіка-матэматычнага напрамку.

Пераможцы і прызёры міжнародных алімпіяд, якія праведзены з удзелам Міністэрства адукацыі, на адпаведныя спецыяльнасці будуць залічаны без уступных выпрабаванняў. Пераможцы Рэспубліканскіх алімпіяд, узнагароджаныя дыпломамі 1, 2, 3 ступені (у мінулым годзе толькі 1-й ступені), а таксама ўзнагароджаныя нагрудным знакам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці будуць залічаны без уступных выпрабаванняў. Пры паступленні на іншыя спецыяльнасці пераможцы названых алімпіяд атрымаюць па адпаведным прадмеце адзнаку "10".

Шматгадовай традыцыяй універсітэта з'яўляецца правядзенне алімпіяд "Абітурыент БДУ", пераможцы якой залічваюцца на адпаведныя спецыяльнасці без уступных выпрабаванняў.

На бюджэтную форму навучання прыём дакументаў ад паступаючых будзе ажыццяўляцца **з 23 чэрвеня па 4 ліпеня**, а экзамены будуць праведзены **з 6 ліпеня па 20 ліпеня**. На платнае навучанне можна паступаць і па субяседаванні па ўсіх прадметах уступных экзаменаў, якое адбудзецца **з 18 ліпеня па 20 ліпеня і з 6 жніўня па 8 жніўня**. На факультэты кіравання і сацыяльных тэхналогій, менеджмента нерухомай маёмасці і ў Міжнародны гуманітарны інстытут, дзе навучанне ажыццяўляецца толькі на платнай аснове, дакументы ад паступаючых будуць прымацца **з 23 чэрвеня па 23 ліпеня**. Акрамя таго, у гэтым годзе для ўдзелу ў конкурсе на платнае навучанне будуць дапускацца асобы, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены ў другіх дзяржаўных ВНУ пры ўмове супадзення прадметаў уступных экзаменаў.

Веды абітурыентаў будуць ацэньвацца па дзесяцібальнай сістэме. Да далейшых экзаменаў пры паступленні на бюджэтную і платную формы навучання не будуць дапускацца абітурыенты, якія атрымалі адзнакі "0", "1", і "2" або не з'явіліся на экзамен без уважлівых прычын.

Калі вы паступіце ў БДУ, то атрымаеце незалежна ад абранай спецыяльнасці адукацыю сусветнага ўзроўню. Уступныя экзамены ва універсітэце завершацца да 20 ліпеня, што дазволіць вам у выпадку няўдачы ўдзельнічаць у конкурсных выпрабаваннях у іншых ВНУ або быць залічаным на платнае навучанне.

Падрабязна азнаёміцца з умовамі прыёму, парадкам правядзення экзаменаў, з факультэтамі можна ў прыёмнай камісіі, якая размешчана ў геаграфічным корпусе па адрасе:

**вул. Ленінградская, 16, пакой 112,**
**тэлефон: 226-59-51.**

Выставки



**В выставочном зале ГГУ, куда они собираются уже далеко не в первый раз, их всегда встречают очень радушно и тепло. Так было и на этот раз, когда по традиции Комитет по труду и социальной защите облисполкома, городской центр социального обслуживания семьи и детей, Гомельское районное благотворительное общественное объединение "Семья" провели в стенах университета областную выставку творческих работ детей и молодежи с ограниченными возможностями.**

## "МУЗЫКА ДУШИ"

... В их работах, таких разных по жанрам, технике исполнения, не было минорного настроения, они искрились жизнью, светом, вдохновением. И очень точно, на взгляд жюри, придумал название к выставке один из ее участников – "Музыка души", за что получил специальный приз. Действительно, чтобы создать произведения, которые посетители увидели здесь, нужна трепетная, тонкая, не ожесточившаяся из-за физического недуга душа, в которой в момент вдохновения может зазвучать прекрасная мелодия.

Около 50 работ было представлено в 14 номинациях: декоративно-прикладное искусство, живопись, литературное творчество и т.д. Пока члены жюри внимательно изучали все, что сотворили ребята, те с вдохновением смотрели концерт, подготовленный для них учащимися техникума железнодорожного транспорта.

Лучшими в номинациях стали: С. Любанец, М. Синило, Р. Розинко, В. Кветковский, И. Дубровская, М. Серафимович, Е. Анпилогова, Ю. Булахова, Ю. Кохан, А. Ющенко, О. Скрипюк, Е. Граменко, А. Аристархова. Приз зрительских симпатий завоевала группа детей из г. Калинковичи. Почетного звания «Мастер» были удостоены Т. Вакарина, И. Лапицкий, С. Сапоненко. Победители получили грамоты и призы, а все участники конкурса – подарки. Ими же порадовали участников выставки студенты нашего университета – члены общества «Друг детей».

Спорт и личность

# ОТ МАРАФОНА – К МАРАФОНУ

**На прошедшем в Польше Вроцлавском Международном марафоне, в возрастной группе М 50-54, сотрудник нашего университета занял I место и получил золотую медаль.**

Со своим собеседником я познакомился осенью прошлого года – он помог мне с ремонтом фотолаборатории. Знакомьтесь: Владимир Николаевич Калинков, ведущий инженер эксплуатационно-технического отдела ГГУ. Кстати, окончил механико-математический факультет в 1976 г. Более близкое знакомство состоялось месяц назад на улице – случайно довелось увидеть заработанную Владимиром за спортивные достижения золотую медаль, красивую и увесистую. Я поздравил В. Калинкова с успехом и предложил сфотографировать его для нашей многотиражки. Когда был готов снимок, в редакции созрело решение взять у В. Калинкова интервью. Беседа состоялась за его рабочим столом у персонального компьютера. Такое своеобразное интервью с мышкой в руке.



**– Владимир, сколько стартов было в этом году?**

– Три. 16 марта на «Призы открытия сезона» в Жодино бежал 20 км в возрастной группе М 50 и финишировал первым. 12 апреля принял участие в Осиповичском межгосударственном марафоне памяти Героя Советского Союза Королёва и стал вторым, и 27 апреля третий – Вроцлавский международный марафон принес мне I-е место в возрастной категории М 50-54.

**– Когда довелось пробежать свой первый в жизни марафон?**

– В 1991 году, в Москве на ММММ (Московский международный марафон мира).

**– Как ты оказался в рядах его участников?**

– Друзья пригласили и я поехал, и побежал.

**– Каким получился дебют?**

– Дебют был тяжелым ... После забега твердо решил начать регулярно тренироваться. Сначала бегал три раза в неделю, а в настоящее время – каждый день.

**– Пользуешься ли специальными методиками подготовки?**

– Да. В Интернете нашел соответствующую статью, перепечатал и использую отдельные ее моменты.

**– Есть ли у тебя тренер?**

– На российском телевидении есть передача «Сам себе режиссер», а у меня – «Сам себе тренер». Консультируюсь у сильных марафонцев.

**– Какими видами спорта занимался раньше, до марафонских забегов?**

– Футболом и видами многоборья ГТО, а потом бегом на длинные дистанции и в 39 лет впервые пробежал 42 км 195 м.

**– На работе бывают «марафоны»?**

– Да, практически каждый день. По специфике своей работы ежедневно приходится обходить учебные корпуса, общежития. В прошлом году был организован студенческий строительный отряд по ремонту университетских аудиторий и помещений. Пришлось обучать студентов работать. Составлял сметы, получал материалы, занимался актами их списания...(в подтверждение своих слов Владимир раскрывает толстые папки с разными, необходимыми в его повседневной работе документами) и так до бесконечности.

**– В чем «соль» марафона?**

– В финише. В преодолении самого себя.

**– Какие планы на будущее?**

– Спортивные: пробежать в Санкт-Петербурге марафон «Белые ночи» 21 июня и Минский международный марафон 3 июля в «День независимости Республики Беларусь». Производственные: в летний период силами стройгруппы выполнить большой объем ремонтно-строительных работ в нашем университете.

**Беседовал В. ЧИСТИК.**
**Фото автора.**

Скоро отпуск

# СОБИРАЙТЕСЬ К МОРЮ



**Долгожданная пора летних отпусков – не за горами. Где его провести с пользой для здоровья, не забывая при этом о своих финансовых возможностях? Такой вопрос стоит теперь перед каждым из нас.**

Достаточно широкий выбор мест для отдыха предлагают различные турфирмы, сотрудники которых стали теперь частыми гостями и в профкоме нашего университета. Возможно, предложенные ими варианты покажутся вам приемлемыми и вы решитесь собраться в дорогу. Итак:

свои услуги предлагает база отдыха «Тирис» на берегу Черного моря в п.г.т. Затока Белгород-Днестровского района Одесской области, К услугам отдыхающих – 2-х, 3-х, 4-х местные домики, размещенные на расстоянии 15-20 м от моря. В них есть холодильник, мебель. На территории базы – столовая на 200 мест, детский бар, дискобар, детская игровая площадка, видеозал, комната отдыха с телевизором. Организовываются поездки на рынки в Одессу и Белгород-Днестровск.

Проживание, 3-х разовое питание в июле обойдутся вам в день в сумму 8 у.е., в августе – 9,2 у.е.

**Заезды: с 25.06 по 3.07; с 4.07 по 13.07; с 14.07 по 23.07 и т.д.**

**Обращаться в профком ГГУ, тел. 57-19-22.**

***

**Евпатория** (детский оздоровительный центр «Огонек»), 17 дней, стоимость – 115 у.е.;

**Евпатория** (гостиница «Мойнаки» с у/д на этаже), 17 дней, стоимость – июнь – 45 у.е., июль-август – 75 у.е.;

**Евпатория** (гостиница с удобствами «Юпитер»), 12 дней, стоимость – июнь – 45 у.е., июль-август – 65 у.е.;

**Алушта** (пансионат с лечением «Сев. Двина»), 12 дней, стоимость – июнь – 150 у.е., июль-август – 160 у.е.;

**Одесса** (пансионат в Коблево, база отдыха в Каролино-Бугаз), 11 дней, стоимость – июнь – 85 у.е., 70 у.е., июль-август – 90 у.е., 75 у.е.

**+ проезд на автобусе «Мерседес» или поездом.**
**Тел. для справок: 567-000.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры філасофіі выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку названай кафедры доктару філасофскіх навук, прафесару **КАЛМЫКОВУ Уладзіміру Мікалаевічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **ЖОНКІ**.


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by
Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4264
Падпісана да друку 10.06.2003 г.